Міхась Зарэцкі

БАЦЬКАЎ СЫН



МЕНСК 1932
ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

БІБЛІОТЭКА МАЛАПІСЬМЕННЫХ

М. ЗАРЭЦКІ

БАЦЬКАЎ СЫН

АПАВЯДАНЬНЕ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК ЛіМ 1932

Вокладка М. Гутмана

Заказ № 1205. 7000 экз. (1/2 арк.) Галоўлітбел № 982.

Друкарня імя Сталіна.

БАЦЬКАЎ СЫН

Увечары, як Сьцёпка ўпарадкаваў скаціну і, змораны дзённай працай, уваліўся ў сваю мізэрную хатку, маці сказала яму:

— Хоць-бы ты, сынок, да таткі даведаўся, занёс яму што-якое. Мо' галадуе там, у лесе?

Гаварыла старая ціхім, прытоеным голасам, быццам баялася, каб хто не падслухаў. Сьцёпка таксама ёй адказаў:

— Мамка! Змарыўся я, ног пад сабой ня чую.

А ў думках мігнула:

— Лес, нетры... могільнік па дарозе... Страшна!..

Здрыгануўся міжвольна. А матка больш не настойвала. Уздыхнула цяжка, глыбока.

— Як сабе хочаш, сынок...

Колькі ціхай пакоры ў сумным матчыным голасе, колькі журбы нявыводнай!.. Ах, нашто яна так, лепей-бы сварылася, дык ўпяўся-б, не пашоў на наругу. А так — няма сілы, каб не пайсьці. Хоць і страшна, хоць і жудасьць хапае пры думцы аднэй...

І Сьцёпка пашоў. Адразу, нават не пачакаўшы вячэры, бо знаў, што калі замарудзіць, — больш страху, жудасьці набярэцца.

Сьцёпка добра помніць тое месца. Там дзе лес пераходзіць у багну, дзе пачынае пад нагамі сьлюнава цьмякаць набраклы вільгацьцю дол, там трэба шукаць маленькай вузенечкай сьцежкі. По-

тым па ёй сярод куп'я, карчоў— валасатых страшыдлаў, паміж чорных лужын бяздонных, пакуль не адкрыецца ўзгорак, быццам нейкая выспа сярод багны-балота. Па ўзгорку направа, у бок, да густога калматага хмызьніку. Там спыніцца, ціханька сьвіснуць...

Сьцёпку самае галоўнае — да лесу дабрацца. Там ня так страшна: лес свой, лес ня выдасьць. У лесе кожнае дрэва знаёмае, кожная сьцежачка. А вось пакуль да лесу... Вакол вёскі жандары польскія нікаюць, падсьцерагуць часам— крышка тады і бацьку і яму.

А страшней за ўсё — могілкі. Чаму так баіцца іх Сьцёпка? Чаму такі жах наганяюць яны сваімі старымі пакарожанымі бярэзінамі, сваімі крыжамі паніклымі? Ня верыць Сьцёпка ні ў чарцей, ні

ў нябожчыкаў, ведае—глупства гэта адно, ня ўстануць мерцьвякі з могілак, не задушаць яго. А вось страшна нечага.

Бяжыць Сьцёпка краем дарогі, прыгінаецца нізенька, вострымі вочкамі бяздонную цемру сьвідруе. Ззаду, здаецца, нехта паўзе, насьцігае. Вось хапае ўжо за полы доўгай сарочкі... Уцякаць?..

Не, гэта так, толькі здаецца. А пабегчы—тады прапаў, тады ўжо не адкараскаешся ад страху.

Наперадзе загараджвае дарогу цёмная пляма. Распаўзлася абапал дарогі, берагі свае ў цемры разбавіла, зьлілася з цемрай. Гэта—могілкі...

У Сьцёпкі ня сэрца ў грудзёх, жалезны клявец—гэтак стукае, б'ецца. Але ідзе, ня спыняецца.

Чорная пляма разгарнулася ўшыркі, увабрала яго ў сваё нутро. З бакоў заплавалі няясныя цыбатыя цені крыжоў. Здаецца, пасуваюцца, набліжаюцца да дарогі.

А гэта што?.. Быццам нейкія крокі?.. Не, гэта-ж сэрца так б'ецца. Глупства. Зараз канец, там поле, а далей і лес ужо.

Раптам паблізу хруснула нешта. Ірвануўся Сьцёпка, у нагах нэрвовыя дрыжыкі... Але стрымаўся, заспакоіў сябе:

— Глупства. Мо' птушка?

Наўмысьля ход замарудзіў. Пашоў, гледзячы проста перад сабой у кропку адну. Вось канец. Лёгка ўздыхнуў, шпарчэй пасігаў па дарозе.

Лес раптам насунуўся вялізнай хмурай грамадой. Як уваходзіў

Сьцёпка ў яго, пачуў сябе маленькім-маленькім, быццам казюлька якая. Але пасьмялеў, бо хіба-ж можа што стацца гэткаму маленькаму хлопчыку пад аховай магутнага лесу-дзядулькі!

Ішоў па лесе вобмацкам. Натыкаўся на дрэвы і, мінаючы, абымаў іх з нейкай шчырай дзіцячай ласкай.

Патаемную сьцежку ўраз адшукаў, бо ня зьлічыць нават, колькі разоў вымерыў ён сваімі маленькімі крокамі гэтую дзікую мясьціну. Па сьцежцы паціху пашоў, мацаў нагой, каб ня зьбіцца, бо троху ў бок—і капут, загрузьнеш у багне. Доўга прышлося цягнуцца. Змора валіла з ног, да зямлі прыціскала. Але ішоў, ня спыняўся.

Урэшце сьцежка вільнула раптам у бок, і Сьцёпка пачуў пад

нагой цьвёрды, бясьпечны грунт. Тут—направа цяпер.

Пашоў вольна, размашыста, нават галаву задраў угару. Цяпер ён не баіцца. Ані крушыначкі! Чаго-ж яму баяцца, калі тут— колькі крокаў--і свае людзі: бацька, хлопцы вясковыя... А як бацька ўзрадуецца!

Вось і хмызьнік. Сьцёпка спыніўся. Перавёў дух, каб ямчэй было сьвіснуць, бо гэта-ж самае цікавае. Вось толькі як: ці ў прыгоршчы, ці ў два пальцы? Лепш у прыгоршчы, мусіць, бо яно ў яго надта спрытна выходзіць, якраз, як сава.

Сьцёпка склаў рукі, прыладзіўся.

— Фіў...

Усьміхнуўся здаволена. І сапраўды—якраз, як сава... Зараз адкажуць. Тады можна пайсьці.

Але нешта ня чутна. Што-ж гэта, няўжо не пачулі? Трэба другі раз...

Ізноў ня чуваць. Паждаў часінку, яшчэ раз сьвіснуў.

Ізноў ня чутна адказу. Няўжо ўсе паснулі? Ня можа быць, варта павінна стаяць.

І раптам страх ахапіў Сьцёпку. Зноў пачуў сябе адзінотным. Няўжо нікога няма? Няўжо пашлі куды ў іншае месца? Што-ж цяпер? Назад?..

Уявіў сабе Сьцёпка дарогу: балота, могілкі...

— Не, не пайду. Трэ' пагля-дзець, мо' і сапраўды паснулі.

Сьцёпка палез у кусты. Асьцярожна рассуваў мяккае вецьце, часам спыняўся, прыслухваўся.

Ціха. Ані зыку, ані шолаху.

І чым далей, тым больш ахапляў. Сьцёпку жудасны страх. Шчыльней туліўся ён да зямлі, віўся па ёй, як вужака.

Раптам скрозь вецьце агоньчык блісnуў. Сьмялей папоўз Сьцёпка. Зноў агарнула радасьць, здаволеньне. Праз колькі крокаў палянку ўбачыў наперадзе. Па ёй сьвет бегае цьмянымі дрыжыкамі, варушыць, карабаціць сонную траву. Гэта—ад вогнішча, што недалужна згасае сярод палянкі. І—што гэта?—вакол нікагуткa. Пуста.

Сьцёпка паціху высунуўся на палянку, пільна прыслухаўся. І раптам—быццам ударыла яго што, ашаламіла. Лёг на зямлю, прытаіўся, поўны вострага палкага жаху.

Ці не здалося гэта яму? Не, во яшчэ... яшчэ... Хрыпіць нехта. Ды так-жа страшна, жудасна...

Задрыжэў Сьцёпка ўвесь. Ляжаў нярухліва, ня знаў, што рабіць. А там усё хрыпіць, усё хрыпіць...

Урэшце Сьцёпка набраўся адвагі, узьняўся паціху, пачаў уважна разглядаць палянку.

— Вунь ён!..

На ўскраю паляны цьмяны выблеск згасаючага вогнішча вызначыў цёмную фігуру. Нехта ляжыць, стогне. І больш мусіць нікога няма, адзін ён.

Сьцёпка троху счакаў і потым гукнуў палахліва:

— Дзядзечка!

І сам зьдзівіўся свайму голасу: такі слабы, ледзь чутны. Другі раз паклікаў:

— Дзядзька!

У адказ зноў пачуўся цяжкі жудасны хрып. Тады ён бліжэй

падышоў, пачаў разглядаць. У твар зазірнуў. І раптам кінуўся з дзікім прарэзьлівым крыкам:

— Татачка!..

Бацька пазваў сына. Напружыўся і загаварыў скрозь сударгавую хрыпоту:

— Сьцёпка... сыночак... гэта ты... забілі мяне... знайшлі... выказаў нехта... Уцяклі каторыя... у Седлішча... так згаворана было... Ой, цяжка, баліць...

Зноў захрыпеў, застагнаў. На вуснах злавесным булькатам чорная кроў.

Сьцёпка горка, адчайна плакаў. У роспачы туліўся галавёнкаю да бацькавых грудзей.

Бацька раптам заварушыўся.

— Ой... цяжка... гарыць, ой... ой...

Апошні ўздых—і выпрастаўся, змоўк. Сьцёпка перш не зразумеў, потым усё стала ясна.

— Памёр!.. Няма таткі!..

І дзіцячая крыўда агарнула болем пякучым. Сьлёзы яшчэ мацней паліліся, зьмяшаліся з бацькавай крывёй.

З гадзіну сядзеў так ля бацькі, плакаў усё. Потым устаў, азірнуўся.

Вогнішча згасла ўжо. Цемра ўсё заліла, затапіла.

У Сьцёпкі ў галаве біліся думкі. Новыя, напружаныя.

— Хто гэта? За што? За што яго татку згубілі?

Успомніў польскіх жандараў, якія ўвесь час бацьку шукалі, якія ня раз яго самога пыталі і білі. І дзіцячыя кулачкі моцна сьціснуліся ад прыліву вострага гневу.

— Гэта яны... яны забілі татку...

І разам у дзіцячай галаве стальлю прарэзалася пастанова:

— Не пайду ў вёску, ня хочу... У Седлішча, казаў, уцяклі... Пайду шукаць...

Адважна разгарнуў кусты і пасігаў у той бок, дзё, як ён знаў, было Седлішча...

. . . .

Матка чакала Сьцёпку. Усе вочы праглядзела, вушы праслухала. Горам ахінулася матчына сэрца.

Няма сынка, ня чуваць.

Няма і ня будзе. Доўга ня прыдзе, дарма, што так пільна яго матка чакае.

Ня прыдзе затым, што ён бацькаў сын і будзе рабіць бацькаву справу...

ЦАНА 15 кап.